# НАЦЫЯНАЛЬНЫ СКЛАД ГАРАДСКОГА НАСЕЛЬНІЦТВА ЯК ФАКТАР УПЛЫВУ НА СТАН І ЎЗРОВЕНЬ КУЛЬТУРНАГА РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКІХ ГАРАДОЎ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

В.Б. Казакевіч г. Мінск, БДПУ

У другой палове XIX – пачатку XX ст. культура беларускіх гарадоў развівалася ў новых капіталістычных умовах, у цеснай сувязі з фарміраваннем буржуазнага грамадства і станаўленнем беларускай нацыі. Перад беларускім грамадствам стаяла складаная задача спалучэння працэсаў культурнага развіцця, выкліканых патрабаваннямі новага часу, з базавымі каштоўнасцямі і нацыянальнымі традыцыямі мінулых стагоддзяў.

Адным з важнейшых фактараў, аказаўшых уплыў на культурны стан і ўзровень беларускіх гарадоў ў канцы XIX – пачатку XX ст., з`яўляўся нацыянальны склад гарадскога насельніцтва, які вызначаўся этнічнай і рэлігійнай разнастайнасцю. Адносна дакладнай крыніцай звестак аб нацыянальным складзе насельніцтва з'яўляецца перапіс 1897 г., якім на падставе роднай мовы, вылучаюцца сваімі памерамі прадстаўнікі дзевяці нацый, пражываючых у беларускіх гарадах. З агульнай колькасці пражываючых у Беларусі ў гарадах было: 62,9% татар, 37,5% рускіх, 46,1% яўрэяў, 48,9% немцаў, 1,5% латышоў, літоўцаў і ўкраінцаў адпаведна – 0,8% і 2,5%. У гарадах было засяроджана 82,0% прадстаўнікоў малых нацыянальных груп, што складала іх падаўляючую большасць. Беларусаў у гарадах у 1897 г. пражывала 137,6 тыс. чалавек, што складала толькі 2,5% ад усяго насельніцтва. А ўсяго у Беларусі ў канцы XIX ст. пражывалі прадстаўнікі 51 нацыі [1, с. 56–59; 2, с. 76–79; 3, с. 104–109; 4, с. 80–83; 5, с. 96–99].

Пад уплывам індустрыяльнага развіцця беларускія гарады сцягвалі да сябе разнаэтнічнае насельніцтва, садзейнічалі пазітыўным вынікам у этнакансалідацыйных і інтэграцыйных працэсах, стваралі ўнутраныя прадумовы для развіцця матэрыяльнай і духоўнай культуры буржуазнага грамадства, фарміравання нацыі. Па дадзеным таго ж перапісу 1897 г. сярод гарадскога насельніцтва яўрэі складалі 53,2%, рускія – 17,8%, беларусы – 13,2%, палякі – 11,8%, немцы – 1,3%. Удзельная вага прадстаўнікоў другіх нацыянальнасцей не дасягала і аднаго працэнта: украінцы складалі 0,9%, татары – 0,6%, латышы – 0,4%, літоўцы – 0,2% [1, с. 56–59; 2, с. 76–79; 3, с. 104–109; 4, с. 80–83; 5, с. 96–99].

Такім чынам, агульны аналіз этнічнай структуры гарадскога насельніцтва, асэнсаваны на падставе перапісу 1897 г., сведчыць, што гарадское насельніцтва ў канцы XIX ст. па свайму складу было многанацыянальным і разнастайным, што ў многім тлумачыцца даўнімі этнічнымі традыцыямі ў краі. Менавіта многанацыянальнасць беларускіх гарадоў выступала тым унутраным фактарам, які разам з іншымі абумовіў адначасовае культурнае развіццё разнатыпных этнічных аб'яднанняў у буржуазным грамадстве Беларусі. З аднаго боку, духоўная

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

культура кожнай этнічнай групы захоўвала свой традыцыйны этнахарактар, лад жыцця, звычаі, абрады, мову і г.д., імкнулася развіваць сваю нацыянальную самабытнасць. А з другога, - многанацыянальны склад гарадскога насельніцтва на этапе буржуазнага развіцця краю садзейнічаў этнакансалідацыйным і інтэграцыйным працэсам.

Безумоўна, пэўны ўплыў на культурны стан беларускіх гарадоў і іх ролю ў развіцці важнейшых нацыянальных працэсаў у краі аказвае працэнтная перавага сярод гарадского насельніцтва прадстаўнікоў таго ці іншага этнасу. У гарадах пяці заходніх губерняў у канцы XIX ст. пераважала яўрэйскае насельніцтва, дзе яно складала 53,2% гараджан, хаця ва ўсім насельніцтве краю ўсяго – 14,1%. Сярод гандлёва-прамысловага насельніцтва іх удзельная вага ў 1897 г. дасягала 60%, а *сярод гільдыйскіх купцоў – 86,2% [1, с.56 – 59; 2, с. 76 – 79; 3, с. 104 - 109; 4, с. 80 - 83; 5, с. 96 - 99].*

*Такая пераважная большасць яўрэйскага насельніцтва сярод гараджан была* характэрна для гарадоў усіх беларускіх губерняў, акрамя Віленскай, дзе яно складала 43,1% гараджан. Значная ўдзельная вага іх прыпадала на гарады Мінскай губерні – 58,8%, а таксама гарады Гродзенскай, Магілёўскай і Віцебскай губерняў – 57,7%, 52,4% і 52,1% [6, с.30].

У асобных гарадах яўрэі складалі звыш 70 % ад агульнай колькасці насельніцтва. Так, у *сярэдзіне 80-х гадоў XIX ст. у Докшыцах пражывала 75,8%* яўрэяў, у Пінску – *74,3%, у Слуцку – 71,5 %, а ў Бабруйску – 60,5%. Важным* цэнтрам у рысе яўрэйскай аседласці выступаў губернскі горад Мінск, у якім доля яўрэяў сярод гараджан складала 52,3 % [7, с. 81].

Беларускія гарады прываблівалі яўрэйскае насельніцтва тымі жыццёвымі магчымасцямі, якія складаліся ў выніку іх прамысловага развіцця, чыгуначна-транспартнага будаўніцтва, пашыраючымся ўнутраным і знешнім гандлем, адміністрацыйнымі і камунальнымі паслугамі. Вялікая колькасць яўрэйскага насельніцтва ў гарадах тлумачыцца шэрагам гістарычных акалічнасцей і, перш за ўсё палітыкай царскіх улад, накіраванай на ўвядзенне абмежавальных законаў адносна яўрэяў. Так, у 1882 г. царскім урадам быў выдадзены чарговы закон, забараняўшы яўрэям жыць па-за рысай вызначанай ім тэрыторыі, а таксама набываць і арэндаваць зямлю за межамі гарадоў і мястэчак.

Такая ўрадавая палітыка вяла да штучнага перанасялення гарадоў Беларусі яўрэйскімі жыхарамі і істотна стрымлівала, а часам і выключала прыток у іх карэннага сельскага насельніцтва, абсалютная большасць якога адносілася да беларусаў. Яна істотна дэфармавала натуральны працэс росту гарадскога насельніцтва і адмоўна ўплывала на развіццё беларускага нацыянальнага аспекта ў культурным развіцці гарадоў і ўсяго краю.

У 90-х гадах XIX ст."лішняе" яўрэйскае насельніцтва ў гарадах Беларусі складала каля 470 тыс. чалавек, многія з якіх не мелі пастаяннай працы, жылі за кошт выпадковых заробкаў. Аднак, нягледзячы на абмежавальную палітыку царскага ўрада адносна яўрэйскага насельніцтва, яно ў канцы XIX – пачатку XX ст. засяродзіла ў сваіх руках значную частку гандлёва-прамысловай дзейнасці ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гарадах, авалодала неабходнымі для абслугования гарадскіх жыхароў прафесіямі мела высокі працэнт граматнасці. Яўрэйскае насельніцтва мела шырокую магчымасць уплываць на культурны стан беларускіх гарадоў, прынімаць актыўны ўдзел у грамадска-палітычным руху канца XIX – пачатку XX ст.

У беларускіх гарадах, як сведчаць афіцыйныя статыстычныя даныя, прысутнічалі прадстаўнікі не толькі яўрэйскай, але і іншых нацыянальных груп, пражываючых у Беларусі, агульная доля якіх сярод гараджан, акрамя беларусаў, складала 86,8%. Удзельная вага беларусаў сярод гарадскога насельніцтва, як адзначалася вышэй, складала 13,2% [1, с. 56–59; 2, с. 76–79; 3, с. 104–109; 4, с. 80–83; 5, с. 96–99]. Такая ж этнасацыяльная структура ў канцы XIX ст. была характэрна і для насельніцтва беларускіх гарадоў асобных губерняў. Так, доля беларусаў сярод гарадскога насельніцтве вагалася ад 7,6% у Віленскай да 30% у Магілёўскай губерні [1, с. 59; 5, с. 99].

У сувязі з гэтым, звяртае на сябе ўвагу і тая акалічнасць, што насельніцтва беларускіх гарадоў было не толькі многанацыянальным, але і іншаэтнічным вясковаму беларускаму насельніцтву. У культурным і грамадска-палітычным жыцці гарадоў панавала руская мова і культура, якую горад нёс у вёску як праз дзяржаўныя ўстановы, так і па ўсіх лініях гандлёва-эканамічных сувязей.

Такім чынам, культура гарадскога насельніцтва, у сувязі з яго іншаэтнічнасцю, у корні адрознівалася ад духоўнай культуры жыхароў беларускай вёскі, што накладвала адмоўны адбітак на станаўленне беларускай мовы, развіцце беларускай нацыянальнай культуры і фарміраванне беларускай нацыі.

Адначасова звяртае на сябе ўвагу і той факт, што важную ролю ў станаўленні і развіцці культуры гарадоў буржуазнага ўзору адыгрывала этнагенетычная роднасць славянскіх народаў, якія складалі значную частку гарадскога насельніцтва. У 1897 г. каля 43,7% гарадскіх жыхароў Беларусі складалі прадстаўнікі беларусаў, рускіх, палякаў, украінцаў, якія былі блізкімі па мове і амаль не адрозніваліся па абрадах і звычаях. Даволі высокую ўдзельную вагу прадстаўнікі гэтых этнасаў мелі сярод гараджан Віленскай і Віцебскай губерняў, дзе яна складала адпаведна 52,8% і 43,8%. Дастаткова значным гэты паказчык быў і ў гарадах Магілёўскай губерні – 46,6%. Што тычыцца гарадоў Мінскай і Гродзенскай губерняў, то працэнт гарадскіх жыхароў славянскага этнаса быў некалькі ніжэйшым і прыкладна адзінакавым – каля 39,2% [6, с.30].

Розная ўдзельная вага прадстаўнікоў славянскага этнасу ў гарадах беларускіх губерняў тлумачыцца складаным гістарычным лёсам беларускіх зямель і гарадоў, якія на асобных этапах свайго развіцця знаходзіліся пад сацыяльна-эканамічным, палітычным і культурным уплывам Усходу ці Захаду. Аднак, паміж заходне- і ўсходнеславянскімі народамі і ў канцы XIX ст. захоўваліся моўная блізасць, адзінства вера-вызнання, развіваліся эканамічныя і духоўныя сувязі, якія склаліся на працягу стагоддзяў у працэсе працоўнай дзейнасці, быце, сферы вольнага часу. Славянская мова і культура была тым аб'яднальным фактарам, які

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

...ейнічаў працэсам інтэграцыі розных этнічных груп гарадскога асяроддзя ў ...шую нацыю.

У даследуемы перыяд у духоўным жыцці краю адлюстроўваліся не толькі ...гульныя, але і спецыфічныя адметнасці, характэрныя для пэўнага гісторыка-...графічнага рэгіёна, у якім пераважалі прадстаўнікі той ці іншай этнічнай ...моўнай супольнасці.

Польскамоўнае насельніцтва, аказаўшае вялікі ўплыў на развіццё культуры ...арускіх гарадоў, у значнай ступені пражывала ў гарадах Віленскай і ...дзенскай губерняў, дзе яно складала адпаведна 26,67% і 12,6% усіх гараджан. ...гарадах Віцебскай і Мінскай губерняў доля палякаў (па роднай мове) сярод ...раджан вызначалася 8,2% і 7,2%. Самая нізкая ўдзельная вага ...льскамоўнага насельніцтва была ў гарадах Магілёўскай губерні, дзе яно ...кладала 2,7% [6, с. 30].

Адной з асаблівасцей мясцовага польскамоўнага насельніцтва з'яўлялася ...сокая ўдзельная вага ў ім шляхты, што ў значнай ступені было характэрным і ...гарадоў. Менавіта польская шляхта ў гарадах у сілу сваёй падвоенай ...нальнай свядомасці па сутнасці зберагала даўнюю традыцыю гарадскога ...ццэ беларусаў, што з'яўлялася падставай для беларускага адраджэння.

У кантэксце разважанняў аб славянскім адзінстве неабходна вылучыць ...ходнеславянскую этнічную супольнасць, гістарычная і генетычная памяць якой ...рымала і пашырала багатую спадчыну мінулых стагоддзяў у культурным ...цці гарадоў.

Па перапісу 1897 г. рускамоўнае насельніцтва ў асноўным канцэнтравалася ў ...радах Віцебскай губерні, дзе на яго долю прыходзілася 22,1% гараджан [2, с. 76 ...]. Удзельная вага рускага насельніцтва сярод гараджан у Мінскай, Віленскай ...родзенскай адпаведна складала – 19,5%, 18,3% і 15,0% [4, с 80 – 83; 1, с. 56 – ...3, с. 104 - 109]. Самай нізкай у працэнтных адносінах аказалась колькасць ...камоўных гараджан у Магілёўскай губерні, дзе яны складалі ўсяго 13,0% ад ...радскога насельніцтва. Праз рускамоўнае насельніцтва не толькі праводзілася ...фікатарская палітыка царскага ўрада, але пашыраўся духоўны ўплыў ...ейшай рускай культуры на культуру беларускіх гарадоў і ствараліся ўмовы ...фарміравання культуры буржуазнага грамадства.

Доля ўкраінскага насельніцтва сярод гараджан была нязначнай: практычна ва ...гарадах губерняў яна не дасягала нават 1,0%. Выключэнне складалі гарады ...дзенскай губерні, дзе гэты паказчык складаў у 1897 г. 2,3% [6, с. 30].

На долю беларускамоўнага гарадскога насельніцтва Магілёўскай губерні, у ...і беларусы ( па роднай мове) складалі 82,4%, прыпадала 30,0% [6, с. 30]. ...ктычна напалавіну меншай была ўдзельная вага беларусаў сярод гарадскога ...льніцтва ў Віцебскай (15,3%) і Мінскай (11,9%) [6, с. 30] губернях, тады як у ...м па гэтым губернях яны складалі адпаведна 53,0 % і 76,0% [8, с. 329 – 331]. ...Гродзенскай і Віленскай губернях беларусы ў гарадскім насельніцтве ...алі толькі 9,0 % 7,6% [6, с. 30] адпаведна, тады як у цэлым па губернях іх ...дзельная вага адпавядала 44,0% і 56,1% [8, с. 329 – 332]. Абсалютная большасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

беларусаў пражывала ў Мінскай і Віцебскай губернях, дзе яны складалі 76,0% і 53,0% [8,с. 229 – 331]усяго насельніцтва. Аднак, у гарадах гэтых губерняў на іх долю прыпадала ўсяго 11.9% і 13.3% [6, с. 30] гарадскіх жыхароў.

Пад уздзеяннем палітычных і сацыяльна-эканамічных фактараў, абумоўленых галоўным чынам капіталістычным развіццём краю, шматнацыянальныя беларускія гарады сталі пашыранай арэнай для міжэтнічных кантактаў, праз якія ўзмацняліся моўныя, бытавыя, рэлігійныя і культурныя сувязі, што садзейнічала кансалідацыі этнасаў. іх інтэграцыі ў нацыю. У многім аднолькавы гістарычны лёс славянскага насельніцтва, пражываючага на адной тэрыторыі, агульнасць эканамічнага развіцця, блізасць моўных традыцый з'яўляліся асновай для развіцця культуры беларускіх гарадоў ва ўмовах буржуазнага грамадства, для фарміравання нацыянальнай самасвядомасці.

### *Літаратура*


1. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г.; под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб., 1904. Т. IV: Виленская губерния. Тетрадь 3.
2. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. СПб., 1903. Т. V: Витебская губерния. Тетрадь 3.
3. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. СПб., 1904. Т. XI: Гродненская губерния.
4. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. СПб., 1904. Т. XXII: Минская губерния.
5. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. СПб., 1903. Т. XXIII: Могилёвская губерния.
6. Документы и материалы по истории Белоруссии: В 3 т. Мн., 1953. Т. 3.
7. Еврейская энциклопедия: В 16 т. М., 1991. – Т. XI.
8. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Мн., 1994–1995. Ч. 1.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ГОМЕЛЬ В ФЕВРАЛЕ 1917 ГОДА: СОЦИАЛЬНО-БЫТОВОЙ АСПЕКТ (ПО МАТЕРИАЛАМ ГАЗЕТЫ "ГОМЕЛЬСКАЯ КОПЕЙКА")

О.Г. Ященко г. Гомель, УО "ГГУ им. Ф.Скорины"

Начало XX века ознаменовалось активной издательской деятельностью, в белорусских губерниях выходил целый ряд газет, отразивших как повседневную жизнь края, так и его облик в переломные исторические моменты. Обширные и ценные в историко-краеведческом и этнографическом плане материалы представлены совокупностью газет, распространявшихся накануне и в период первой мировой войны. Так, в 1917 году журналисты, реагируя на бурно развивавшиеся события, внесли значительный вклад в документальную летопись эпохи, составив достаточно подробную и в значительной степени правдивую